Источник: **«Рэспубліка» - 2013-03-21**

# Маўчаць званы, гаворыць памяць

*Арына МІКАЛАЕВА*

**22 сакавіка — 70 гадоў з дня трагедыі Хатыні**

З гэтай нагоды пройдзе шэраг памятных мерапрыемстваў. Яны будуць ладзіцца пад эгідай Міністэрства культуры Беларусі, Нацыянальнай акадэміі навук, Мінскага аблвыканкама, Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» сумесна з іншымі арганізацыямі.

Гэтымі днямі паўсюдна людзі будуць гаварыць аб той страшнай трагедыі, схіляючы галовы перад памяццю мірных ахвяр не толькі Хатыні, але і іншых спаленых вёсак, усіх людзей, што загінулі ад рук нацыстаў у гады вайны.

...Страшная трагедыя адбылася 22 сакавіка 1943 года. У гэты дзень раз'юшаныя карнікі ўварваліся ў Хатынь. Жыхары вёскі нічога не ведалі пра тое, што раніцай за 6 кіламетраў ад Хатыні партызаны абстралялі аўтакалону фашыстаў, у выніку быў забіты нямецкі афіцэр. Але ім быў падпісаны смертны прысуд. Мужчын, жанчын і дзяцей выгналі з дамоў і зачынілі ў калгаснай пуні, абклалі саломай, аблілі бензінам і падпалілі. У тых, хто імкнуўся выратавацца, стралялі. 149 чалавек былі забіты ці згарэлі жывымі ў агні. Сярод іх было 75 дзяцей да 16 гадоў. Засталіся жывымі толькі пяцёра дзяцей і адзін дарослы. З пуні ўдалося выратавацца дваім хлапчукам — Антону Бараноўскаму і Віктару Жалабковічу. Антон быў паранены ў нагу, страціў прытомнасць, і карнікі прынялі яго за мёртвага. Паранены ў плячо Віця, калі выбягаў з пуні, трымаў за руку маці. Жанчына была смяротна паранена і, падаючы, засланіла сына ад іншых куль.

Уладзімір Яскевіч паспеў схавацца ў яме, дзе трымалі бульбу. Яго сястра Соф'я (зараз Фіохіна) схавалася ў падвале. Аляксандр Жалабковіч, пачуўшы стрэлы, сеў на каня, паскакаў у лес, а потым да сваякоў у суседнюю вёску. 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, калі выбягаў з пуні, быў паранены, страціў прытомнасць і толькі ноччу ачуняў. Сярод нежывых аднавяскоўцаў ён знайшоў свайго параненага сына — пятнаццацігадовага Адама. Бацька падняў яго на рукі, і амаль у тую самую хвіліну хлопчык памёр. Гэты трагічны момант потым быў пакладзены ў аснову стварэння скульптуры мемарыяльнага комплексу «Хатынь» — «Няскораны чалавек».

На сённяшні дзень жывыя толькі двое відавочцаў той жудаснай трагедыі. Віктар Андрэевіч Жалабковіч і Соф'я Антонаўна Фіохіна (Яскевіч) жывуць у Мінску.

Памятныя мерапрыемствы з нагоды трагічнай даты пройдуць паўсюдна. Сярод найбольш буйных — міжнародная навукова-практычная канферэнцыя ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Й. Рау, дзе збяруцца навукоўцы з Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Украіны, Чэхіі, Сербіі, Ізраіля. Там будуць гаварыць пра гісторыю вядомую і невядомую, пра населеныя пункты, знішчаныя нацыстамі ў Беларусі і іншых краінах Еўропы, пра вайну вачыма моладзі і відавочцаў.

У памяць ахвяр Хатыні і ўсіх загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі пройдзе канцэрт-рэквіем з удзелам Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі.

На працягу года плануецца правядзенне абменных выстаў з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» і мемарыялаў Чэхіі, Польшчы, Германіі, Італіі, Францыі. У бібліятэках, установах адукацыі і культуры да трагічнай даты прымеркаваны кніжныя выставы, пройдуць вечары памяці, гутаркі, урокі гісторыі.

Непасрэдна ў дзень трагедыі, 22 сакавіка, на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь» адбудзецца мітынг-рэквіем. У ім прымуць удзел вышэйшыя службовыя асобы краіны, прадстаўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў, грамадскіх арганізацый, духавенства, сведкі трагедыі. У гэты ж дзень адбудзецца цырымонія гашэння паштовай маркі, прысвечанай 70-годдзю з дня знішчэння вёскі Хатынь.